# ІНДУСТРЫЯ КАМЕРНАГА ТУРЫЗМУ, ЯК УСТОЙЛІВАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА ДЛЯ РЭГІЯНАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ ПРЫБУЖЖА І ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

*Святаслаў Валасюк, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Беларусь*

Турыстычны бізнэс у свеце адносіцца да відаў эканамічнай дзейнасці, якія развіваюцца найбольш імклівымі тэмпамі. Паводле сваёй прыбытковасці турызм сувымерны з нафтаперапрацоўкай. Адначасова, тэндэнцыі, якія назіраюцца ўнутры індустрыі турызму, на нашую думку здольныя істотна паспрыяць устойліваму развіццю рэгіёнаў Прыбужжа і Заходняга Палесся.

Развіццё камерных відаў турызму, якое назіраецца ў апошнія гады, асабліва ў развітых краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі, мае глыбінныя сацыяльна-эканамічныя ды сацыяльна-псіхалагічныя падставы. Шпаркі поступ тэхнічнага прагрэсу, тэхнакратызацыя грамадства, глабалізацыя сусветнай эканомікі спрычыніліся да падвышэння жыццёвага ўзроўню ў постіндустрыяльным грамадстве і ўзмацнення міжнародных гаспдарчых сувязяў з аднаго боку, але і да пашырэння з'явы адчужэння, паскарэння тэмпаў жыцця і страты гармоніі суіснавання з да сябе падобнымі і асяроддзем. Калі раней рэкрэацыя і турызму спадарожнічалі жаданне ўбачыць дзівосы свету, адпачыць ва ўмовах камфорту, то зараз, як гэта ні патэтычна гучыць, турыстамі часцяком рухае патрэба звароту да чагосці сапраўднага, пошука адасобленага кутка, дзе можна запаволіць тэмп жыцця, застацца сам-насам з сабою, адчуць гармонію з асяроддзем, схавацца ад уздзеяння такіх пабочных прадуктаў цывілізацыі, як адпады, забруджвальнікі, шум.

Падобныя з'явы апошнім часам пачалі дастаткова эфектыўна выкарыстоўвацца ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, як адзін з інструментаў дасягнення ўстойлівага эканамічнага развіцця, захавання прыроднай і культурнай спадчыны і вырашэння сацыяльных праблем рэгіёнаў.

У беларускім Прыбужжы і Заходнім Палессі – рэгіёнах выключна прыдатных, мяркуючы па іх прыродных і гістарычных вартасцях, да падобнай дзейнасці, істотных зрухаў у развіцці камернага экспартна-арыентаванага турызму не назіраецца. Аналіз нешматлікіх спробаў наладжвання эка- і агратураў па рэгіёне, прамаванні яго́ных вартасцяў, якія рабіліся энтузіястамі і грамадскімі арганізацыямі на некамерцыйнай аснове, выявіў наступныя акалічнасці, якія замінаюць развіццю камернага турызму ў Прыбужжы й Заходнім Палессі:

1. Негатыўны ўплыў агульнагаспадарчага крызісу і незавершанасці сістэмных пераўтварэнняў. Ва ўмовах, калі вырашальны ўплыў на развіццё тых ці іншых гаспадарчых працэсаў здзяйсняе бюракратычная працэдура, марыць аб развіцці нагэтулькі нетрадыцыйнай для Беларусі дзейнасці ў тым ліку на камерцыйнай падставе не выпадае.

2. Празмерная палітычная цэнтралізацыя, адсутнасць дзейсных механізмаў самакіравання і ўцямнай дзяржаўнай рэгіянальнай палітыкі. У краінах Цэнтральнай Еўропы, у прыватнасці, у Польшчы, развіццё камернага турызму знаходзіць палітычную, фінансавую і кансультацыйную падтрымку органаў самакіравання, грамадзянскай супольнасці, нацыянальнага ўраду і агульнаеўрапейскіх структур. Агратурыстычны бізнэс мае зручную сістэму крэдытавання і не абкладаецца падаткамі, як сацыяльна значны від дзейнасці. Развіццё турызму, таксама, патрабуе ад ураду пэўнай палітычнай празрыстасці.
3. Адсутнасць нацыянальнай традыцыі ўнутранага турызму. Той факт, што ў Польшчы камерны турызм заўсёды быў своеасаблівым нацыянальным хобі, спрыяе выхаду нацыянальнага турыстычнага прадукту на знешнія рынкі.
4. Дэмаграфічны стан. У цяперашняй беларускай правінцыі, перадусім на вёсцы, брак адпаведна адукаваных і працаздольных кадраў, якія маглі б абслугоўваць інфраструктуру камернага турызму.
5. Негатыўныя з'явы сацыяльна-псіхалагічнага кшталту. Паўсюль у Беларусі, асабліва ў сельскай мясцовасці, дзе засяроджаная большасць аб'ектаў эка- і агратурызму, прысутнасць іншаземцаў выклікае падазронасць, а дзейнасць па абслугоўванні іхніх патрэбаў на камерцыйнай аснове – успрымаецца як ганебныя паводзіны. Адначасова, шматгадовая замкнёнасць жыцця беларусаў спараджае ў іх скепсіс адносна таварнай вартасці і прыцягальнасці прыродна-культурнай спадчыны ў якасці рэгіянальнага турыстычнага прадукту.
6. Неўрэгуляванасць у нацыянальным заканадаўстве пытанняў, звязаных з выкарыстаннем нацыянальных рэкрэацыйных і іншых прыродных рэсурсаў, у тым ліку – зямлі.

У працэсе стварэння матэр'яльнай базы і арганізацыйнай інфраструктуры камернага турызму, неабходна імкнуцца да таго, каб рэгіён заняў тую нішу на рынку камернага турызму, якая яшчэ не занятая – прапанову "апошніх дзікіх абшараў Еўропы". Гэтаму спрыяюць наступныя характарыстыкі рэгіёнаў Прыбужжа й Заходняга Палесся:

- параўнаўча невялікая ступень урбанізацыі і антрапагенных змяненняў натуральнага асяроддзя;
- зніжэнне ступені антрапагеннага ўздзеяння на асяроддзе ў выніку эканамічнага спаду апошняга дзесяцігоддзя;
- выключная біятычная разнастайнасць;
- наяўнасць найвялікшых у Еўропе дзікага лесу – Белавежскай пушчы і балотных комплексаў – балоты Дзікое, Званец, Спораўскае;
- найвялікшыя, а пад час адзіныя ў Еўропе папуляцыі раслін і жывёл (некаторыя архідныя, камышоўка вяртлявая, каралеўская папараць, балотная чарапаха ды інш);

- вялікая колькасць аб'ектаў культурнай спадчыны (нп. помнікі палескага драўлянага дойлідзтва) дагэтуль знаходзяцца ў працэсе эксплуатацыі, а не закансерваваныя ў скансенах;
- існуе вялікая колькасць закінутых хутароў і цэлых вёсак, якія з мінімальнымі капітальнымі выдаткамі могуць быць пераўтвораныя ў аб'екты інфраструктуры камернага турызму;
- у сельскай гаспадарцы і вясковым рамесніцтве ў вялікай ступені захаваліся традыцыйныя даіндустрыйныя тэхналогіі, якія маюць праэкалагічны змест, а таксама з'яўляюцца турыстычнай атракцыяй.

Да патэнцыйных спажыўцоў нацыянальнага турыстычнага прадукту ўступна можна залічыць наступныя катэгорыі іншаземных грамадзян:

1. Студэнтаў, перадусім тых, хто навучаецца па спецыяльнасцях "Біялогія", "Геаграфія", "Экалогія", "Ахова навакольнага асяроддзя" ды інш. Досвед арганізацыі некамерцыйных экатураў па Прыбужжы і Заходнім Палессі паказаў, што прыродныя вартасці рэгіёнаў выклікаюць надзвычайную зацікаўленасць нават сярод польскіх студэнтаў, пры тым што польскія прыродныя ўмовы практычна не саступаюць па багацці беларускім, а па свёй ландшафтнай разнастайнасці нават пераўзыходзяць іх. Экатуры для гэтай катэгорыі павінныя мець навуковую накіраванасць, адрозніваццa мінімалізмам у інфраструктуры сервісу і максімальна дэмакратычнымі коштамі.
2. Людзі ва ўзросце каля 27 – 35 гадоў, якія вядуць актыўны і стрэсагенны лад жыцця: прадпрымальнікі, юрысты, тэхнічная інтэлігенцыя. Пабуджальным матывам для дадзенай катэгорыі з'яўляецца магчымасць запаволіцца, адпачыць ад засілля тэхнікі і стрэсагенных фактараў. Сёння ў еўрапейскай бізнес-эліты дастаткова папулярнымі з'яўляюцца такія віды адпачынку, як аматарская арніталогія, фатаграфаванне краявідаў і жывёл у дзікім стане, байдарачныя сплавы. Прыбужжа і Заходняе Палессе прэзентуюць ідэальныя ўмовы для рэалізацыі падобных захапленняў. Сэрвіс для дадзенай катэгорыі павінен уключаць як мага менш тэхнічных і сінтэтычных элементаў, максімум натуральных матэр'ялаў і прадуктаў, утульную і нязмушаную атмасферу побыту.
3. Людзі і сем'і ў перадпенсійным і пенсійным узросце. Сацыяльная псіхалогія еўрапейцаў уключае падсвядомаснае памкненне да вясковага жыцця, валодання сваім домам у вёсцы альбо хутарам. Большасць мае магчымасць рэалізаваць падобныя мары ў сталым веку, калі праца не патрабуе прысутнасці ў горадзе. Пабуджальным матывам для тых, хто мае такую магчымасць з'яўляецца цікавасць да вясковага жыцця ў менш урбанізаванай краіне, а для тых хто яе не мае – рэалізаваць сваю мару хаця б на пэўны час. Дадтковым матывам для часткі патэнцыйных турыстаў з'яўляецца настальгія па часах маладосці, якія праходзілі ў яшчэ мала урбанізаванай Еўропе ў 50 –

60-я гады. Гэтая катэгорыя з'яўляецца ідэальным спажыўцом класічнага агратурыстычнага прадукту – побыту ў вёсцы пад час адпачынку, назіранне за сельскагаспадарчай працай, размовы з гаспадарамі на жыццёвыя тэмы, "сямейныя" ўрачыстасці, асалода ад чыстага паветра і прадуктаў, шпацыр па лесе, збор грыбоў, ягад, рыбная лоўля, катанне на конях ці ровары. Турысты дадзенай катэгорыі патрабуюць большай ступені камфорту, чым астатнія.

Развіццё камернага турызму ў рэгіёне тым больш карыснае, што ён, пры умове навуковай абгрунтаванасці дапушчальных памераў свайго антрапагеннага ўздзеяння, уяўляе ўстойлівую альтэрнатыву нізкаэкалагічнай сельскай гаспадарцы і прамысловасці з аднаго боку, і выступае своеасаблівай кропкай росту ў гаспадарчым і саяльным развіцці рэгіёну з другога. Развіццё спецыфічнай інфраструктуры камернага турызму: баз, лясных сховішчаў, палатачных палёў, экалагічных сцежак і маршрутаў, павінна выклікаць развіццё інфраструктуры сэрвісу: гандлю, фінансавага, мэдычнага, транспартнага і культурнага абслугоўвання ў рэгіёне, а таксама павелічэння ягонай інвестыцыйнай прыцягальнасці, што асабліва важна для ўстойлівага развіцця сельскай мясцовасці.

Яшчэ большую атракцыю для мас замежных турыстаў рэгіён Прыбужжа і Заходняга Палесся атрымае ў сувязі са сваім трансгранічным становішчам, падобна, як гэта было з трансганічнай тэрыторыяй Украіны, Польшчы і Славаччыны, на якую распаўсюджваецца рэжым Міжнароднага рэзервату біясферы "Заходнія Карпаты". Блізкасць такіх выключна цікавых аб'ектаў, як Белавежскі нацыянальны парк, Палескі нацыянальны парк, Палескі і Сабіборскі ландшафтныя паркі (Польшча), Шацкі нацыянальны прыродны парк (Украіна) дадае прыцягальнасці ідэі рэгіянальнага камернага турыстычнага прадукту і вымагае транграцічнай каардынацыі дзеянняў як на ўзроўні рэгіянальных улад, гэтак і бізнэс-структураў і грамадзянскай супольнасці па наданні рэгіёну Прыбужжа і Заходняга Палесся адмысловага ахоўнага статусу, а таксама па распрацоўцы спрошчанага рэжыму перасоўвання турыстаў праз граніцы пад час удзелу ў эка- і агратурах.

## ПРОБЛЕМЫ УПРАВЛЕНИЯ РИСКАМИ В СТРАХОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

*Ю.Н.Павлючук,*
*Брестский государственный технический университет, Беларусь*
*В.Ю. Павлючук*
*Закрытое акционерное общество «Берестье», Беларусь*

**Резюме** В статье рассматриваются специфические особенности деятельности менеджеров, связанной с управлением рисками в страховой деятельности. Приводится краткая характеристика этих особенностей.